**Шпакава, А.** Сніцца даліна з чырвонымі макамі / А. Шпакава // Дняпроўская праўда. – 2007. – 14 лют. – С. 3.

## СНІЦЦА ДАЛІНА З ЧЫРВОНЫМІ МАКАМІ

Гэта потым яму ўспаміналіся маці, бацька, сястрычка, любімы сабака. Паўставалі ў памяці родныя мясціны ў супрацьлегласць узлятаючым пад нябёсы скалам, дзікаму, няшчаднаму сонцу…

Пакуль жа ў мірным жыцці Колі Землянога была вучоба ў СШ № 2 г. Дуброўна. Вясёлыя, бесклапотныя гады. Як і кожны малады чалавек, ён ведаў, што будзе служыць у арміі. Ды і не супраць быў ён служыць. У школе з задавальненнем займаўся на ўроках пачатковай вайсковай падрыхтоўкі. Цікава было збіраць і разбіраць аўтамат, нават страляць з яго ў ціры ў далёкую мішэнь. Канешне, не думаў, што атрыманыя навыкі спатрэбяццца зусім хутка…

Дарослае жыццё ўчарашняга хлопчыка Колі Землянога пачалося вясной 1987 года, калі аўтобус Дуброўна – Віцебск павёз яго разам з іншымі прызыўнікамі далей ад маленькай радзімы, любімага горада Дуброўна.

Нечаканы начны пералёт з Віцебска ў Ташкент, адтуль – у Чэрмез і – навабранцаў прыняла салдацкая «вучэбка». Толькі з цягам часу даведаўся Мікалай, што ў гэтай «вучэбцы» рыхтуюць салдат у Афганістан. Служба армейцаў у «вучэбцы» значна адрознівалася ад службы іх таварышаў ў іншых вайсковых часцях краіны. У «вучэбцы» ўсе заняткі былі сканцэнтраваны на фізічнай падрыхтоўцы, уменні добра страляць, ваджэнні транспарту. Страявой падрыхтоўцы тут не ўдзялялі асаблівай ўвагі. Ды і навошта, калі ўсе ведалі, што там, за ракою, строем хадзіць нікому не давядзецца...

Калі складаў лісты ў Беларусь, хацелася Мікалаю знайсці нейкія асаблівыя, мяккія, прачуленыя радкі для маці, ласкавыя – для сястрычкі, па-мужчынску сталыя – для бацькі.

…Адзін за адным «стрыгункі», як называлі іх камандзіры, прысягалі на вернасць Бацькаўшчыне: «...Я заўсёды гатовы па загаду Савецкага ўрада выступіць на абарону маёй Радзімы – Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, і, як воін Узброеных сіл СССР, я клянуся абараняць яе мужна, умела, з годнасцю і гонарам, не шкадуючы сваёй крыві і самога жыцця для дасягнення поўнай перамогі над ворагам.»

…Узнімаюцца пад нябёсы скалы, парослыя знізу даверху чырвонымі макамі. Усе наўкол зачароўвае чужою прыгажосцю чырвоных макаў. Але… Спрацоўвае інстынкт самаабароны. Прыгадваеш, дзе знаходзішся, што сюды ты прыехаў не на хараство любавацца. Гэта Афганістан – варожая табе чужына. Ваенны гарнізон Пулі-Хумры. Пазней Мікалай Земляны даведаўся, што яшчэ Пулі-Хумры называюць "Далінай смерці".

Мікалай праходзіў службу ў адным з 25 гарадкоў гэтага ваеннага гарнізона. Вадзіў БТР. Увесь час у руху, увесь час у дарозе. Пулі-Хумры-Кабул, Кабул-Пулі-Хумры. Паступова становіцца знаёмым кожны кусцік, кожны каменьчык, кожны паварот, спуск, уздым...

Усім было вядома, што перш, чым адправіцца калона з грузам, на паўкіламетра ўперад пойдуць 2–3 БТРы з мэтай разведкі. Зразумела, што калі раптам узнікне небяспека, увесь агонь на сябе возьме гэты разведвальны атрад і толькі пасля ўслед паедзе машына аховы, якая павядзе за сабою калону з асноўным грузам. І такі рух з дня ў дзень.

Вельмі тужылі былыя «стрыгункі», сёння перахрышчыныя Афганам салдаты, па Радзіме.

Дайте Родіну хоть контрабандой!
Привезите мне лист лопушиный,
Зачерпните стеклянной банкой
Самой жгучей как юность рябины.
Привизите мне бедную лужу,
И блаженный кусок чернозема,
И кузнечика кроткую душу,
И окно материнского дома.
Я воронье гнездо нахлобучу,
Я в малину зароюсь в лукошке,
Привезите мне серую тучу,
И мою Беларусь в ладошке...

Верш аднаго з салдат афганскай вайны. Такія пачуцці жылі і ў душы Мікалая. Але ён трымаў гэта ў думках, лісты ж дадому былі простыя і кароткія: «Прывітанне, матуля, бацька і сястрычка... У мяне ўсё добра...»

Па дарогах далёкага Афганістана Мікалай паерaадолеў не адну сотню кіламетраў. І паўсюль магла аказацца міна, падкладзеная душманамі, з-за кожнага выступу скалы мог прагучаць выстрал.

У той дзень па знаёмым маршруце Пулі-Хумры-Кабул некалькі «адчайных» БТРаў, як заўжды, выехалі разведаць шлях, перш  чым пускаць па ім калону з грузам. Раптам Мікалай адчуў глухі ўдар. Свядомасць згасла...

Цэлы месяц праходзіў паранены лячэнне ў шпіталях Ташкента і Цермеза. Дзякуючы умелым, чуллівым рукам ваенных хірургаў і медыцынскіх сясцёр, Мікалай змог зноў вярнуцца ў строй. І зноў Пулі-Хумры са скаламі, парослымі чырвонымі макамі, зноў знаёмая дарога з яе паваротамі і згібамі, уздымамі і спускамі. Вяртанне Мікалая ў строй было як пратэст тым дужым скалам, вогненнаму сонцу, чырвоным макам...

Праз месяц ваенная часць № 13354, у якой служыў Мікалай, была выведзена з Афганістана, але армейскае жыццё на гэтым не скончылася. Ваеннаслужачых часці № 13354 накіравалі ў Ленінакан на ліквідацыю наступстваў землятрасення. Землятрасенне было моцным, 9 балаў па шкале Рыхтара. Аднымі з першых на месцы трагедыі апынуліся людзі ў вайсковай форме. Сярод іх – Мікалай Земляны з Дуброўна. Іх дапамогу нельга вымераць нічым.

Сёння ў Мікалая ёсць дружная сям'я. Ёсць работа, але не прэстыжная, ды ці галоўнае гэта ў жыцці? Не месца славіць чалавека, а чалавек месца.

Вельмі крыўдна за салдат Афганістана, што ім даводзіцца чуць у свой адрас словы-папрокі пра іх несправядлівы ўдзел у той вайне: «Мы вас туды не накіроўвалі».

Ці ж вінаватыя «афганцы» ў тым, што адтуль яны вярнуліся зусім іншымі, з узросшым пачуццём уласнай годнасці, з абвостраным разуменнем справядлівасці. Можа, гэта высокая, бескампрамісная патрабавальнасць да сябе і акружаючых перашкаджае ім знайсці сябе ў мірным жыцці...

Шкада, што фільм «Дзевятая рота» з 'явіўся на экране толькі цяпер. Магчыма, ужо тады ў многіх, хто паглядзеў бы фільм, іншымі былі б адносіны да воінаў-інтэрнацыяналістаў, а яны, не

саромеючыся, насілі б свае заслужаныя ўзнагароды і расказвалі б пра свой інтэрнацыянальны абавязак.

А Мікалаю і сёння сніцца даліна з чырвонымі макамі, доўгая-доўгая дарога, па якой ён вяртаецца дамоў. На гарызонце ён бачыць сонца, сваё, беларускае. Ён выжыў, ён з намі і ён – Герой.

**Аліса Шпакава**